


# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН РЭКТАРАТА, ПАРТКОМА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА
ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 33 (157) 15 СТУДЗЕНЯ 1991 ГОДА


## У студэнтаў - сесія

### Хто працаваў самастойна — таму няма чаго хваляваццa

Чатырнаццатага студзеня ў нас на матэматычным факультэце пачалася экзаменацыйная сесія. На працягу ўсяго года праводзілася індывідуальная работа са студэнтамі і, можна сказаць, што гэта і была падрыхтоўка да сесіі. А цяпер ідзе залікова сесія. Цвёрда вырашана, што студэнты, не здаўшыя залік, не будуць дапускацца да экзаменаў. Выключэнне можа быць толькі ў выпадку хваробы студэнта.

Пакуль яшчэ гэта не прыняло масавы характар, але асобныя студэнты здаюць экзамены датэрмінова з тым, каб набыць для сябе час на падрыхтоўку па найбольш складаных дысцыплінах.

Паколькі выкладчыкі на працягу семестра часта сустракаліся са студэнтамі, то асобным з іх, паказаўшым выдатныя веды, адразу выстаўляецца адзнака «выдатна» за экзамен. Так, па аналітычнай геаметрыі першакурсніцы **Наталля Лістапад і Наталля Калодка** паказалі выдатныя веды пры здачы пяці тэм і атрымалі адзнаку «выдатна» за экзамен, не здаўшы яго. Па матэматычнаму аналізу некаторыя студэнты таксама атрымаюць выдатныя адзнакі па выніках работы на працягу семестра.

Упершыню на нашым факультэце на другім курсе ўведзена рэйцінгавая сістэма па матэматычнаму аналізу. Уся работа, якую студэнт павінен выканаць на працягу семестра, (калёквіумы, індывідуальныя заданні, кантрольныя работы), ацэнена ў 200 балаў. Студэнт мае права пераздаваць тыя або іншыя работы на працягу семестра, але не больш двух разоў. Студэнт, набраўшы 190 балаў, атрымлівае адзнаку «выдатна» за экзамен. Студэнт з рэйцінгам больш 155 балаў — атрымлівае залік; з рэйцінгам 155 і менш балаў — піша кантрольныя работы (па 40 балаў кожная), пакуль не набярэ больш 155 балаў. Студэнту з рэйцінгам 170 — 189 балаў па яго жаданню можа быць выстаўлена адзнака «здавальняюча». Калі ж ён вырашае здаваць экзамен, то выстаўляецца тая адзнака, якую ён атрымлівае на экзамене, у тым ліку і «нездавальняюча». Рашэнне студэнтам прымаецца да пачатку экзаменаў па курсу ў яго акадэмічнай групе.

Гэта сістэма заахвочвае студэнтаў працаваць сістэматычна. Асобныя з іх выйграюць. Лягчэй сістэматызаваць атрыманыя веды пры падрыхтоўцы да экзаменаў.

Сістэма вышэйшай адукацыі — гэта ў асноўным сістэма самастойнай работы. Таму нам трэба працаваць менавіта ў тым напрамку, каб развіваць у студэнтаў неабходнасць працаваць самастойна. А раней, нажаль, на гэта націск не рабілі. Патрэбна ж ужо са школы прывучаць будучых студэнтаў працаваць самастойна.

**Л. КІРЫЛЮК**
**дэкан матэматычнага факультэта**

## ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЁ

**Сёння на пытанні нашага карэспандэнта адказвае старшыня студэнцкага прафсаюзнага камітэта ІРЫНА АНТОНАЎНА БЯЛОВА.**

**— Ірына Антонаўна, вы працуеце старшынёй прафкома нядаўна. Давайце пачнём з таго, што баліць. Што вас хвалюе на пачатку новага года больш за ўсё!**

— Так, працую я ўсяго 4 месяцы, да таго ж, на паўстаўкі. Адначасова з´яўляюся студэнткай чацвёртага курса дзённага

### Калі магчымасці не задавальняюць патрэбы

аддзялення факультэта правазнаўства. А хвалюе мяне наша недалёкая будучыня. З новага года абком прафсаюза працаўнікоў народнай асветы адмовіўся даваць нам грошы. Усе буйныя арганізацыі і прадпрыемствы цяпер не аддаюць у аблсаўпроф пэўны працэнт ад сваіх прафсаюзных узносаў. Абком прафсаюза працаўнікоў народнай асветы выдзяляе нам 4 тысячы рублёў на ўтрыманне вызваленых работнікаў прафсаюзнай арганізацыі, але гэтых грошай мала. У сувязі з гэтым людзі, што ў нас працуюць, як кажуць, павіслі ў паветры. Гэта старшыня студэнцкага клуба Міхаіл Крумер, мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба Дзмітрый Абразцоў і старшыня спартыўнага клуба Іван Белавокі. Мы паслалі запыт у Міністэрства народнай асветы, каб даведацца, ці зможа яно фінансаваць работнікаў студэнцкага клуба, але адказу пакуль што няма. Вось і паўстае пытанне: ці быць сёння студэнцкаму клубу, калі няма ў яго грошай?

**— Магчыма, з гэтым звязана і правядзенне платных вечароў!**

— Так. Мы добра разумеем, што ва ўмовах рыначнай эканомікі студэнты і так становяцца адной з самых малазабяспечаных катэгорый насельніцтва. Аднак вымушаны браць з іх грошы за ўваход на вечары адпачынку, дыскатэкі. Інакш гэтыя мерапрыемствы немагчыма будзе правесці. Стараецца знайсці выйсце з такога становішча і спартыўны клуб. З новага года ён адкрывае свой рахунак у банку, платныя гурткі і секцыі. Такім чынам, клуб зможа зарабляць грошы і весці спартыўную работу сярод студэнтаў.

**— Акрамя штатных работнікаў студэнцкага клуба, якіх вы назвалі, ці ёсць яшчэ памочнікі, так званы прафсаюзны актыў!**

— Засмучае тое, што студэнты нічога не хочуць рабіць бясплатна. Але ёсць сярод рабят і такія, хто ад усёй душы дапамагае прафкому. Гэта старшыня студэнцкага клуба інтэрната № 2 Сяргей Шэўчык, старшыня студэнцкага клуба інтэрната № 3 Генадзь Роўскі. Ва ўсім дапамагаюць мне, заўсёды цікавяцца прафсаюзнай работай Марына Ядэшка і Валянціна Савіч з факультэта пачатковага навучання. Ёсць у прафкоме яшчэ і казначэй А. Вінарская. Але працуе яна на грамадскіх пачатках і ў асноўным усю работу прыходзіцца выконваць мне.

**— Відаць, цяжка і працаваць, і вучыцца адначасова!**

— Вопыт прафсаюзнай работы ў мяне пакуль што невялікі, таму прыходзіцца і ў камітэт камсамола зайсці параіцца, і ў абком прафсаюза. З боку ж студэнтаў былі скаргі, што прафком зачынены. Хачу, каб зразумелі мяне правільна: не магу я ператварыцца ў вартаўніка кабінета, не магу сядзець і чакаць, пакуль хто прыйдзе нешта папытаць. Але ж хацелася б часцей бачыць тут студэнтаў. Заўсёды буду рада аказаць дапамогу, знайсці справу па душы, калі пажадаеце стаць нашымі памочнікамі. І выбачайце, калі дзверы прафкома падчас будуць зачынены. Не палянуйцеся, зайдзіце яшчэ раз.

**— На якіх праблемах, напрамках у рабоце вы хацелі б сканцэнтраваць асаблівую ўвагу!**

— Пакуль мяне вельмі турбуе лёс студэнцкага клуба, рабят, што там працуюць. І другое. Гэта матэрыяльнае становішча студэнтаў ва ўмовах рыначнай эканомікі. Як дапамагчы ім у гэтых умовах? Часткова павінен падтрымаць студэнтаў нядаўна створаны фонд матэрыяльнай дапамогі.

**— Ваш погляд у будучае, чым хацелі б заняцца!**

— Задумак шмат. Так, напрыклад, хацелася б, каб і выязны гандаль быў кожны тыдзень па вызначаных днях. Але гэта не толькі ад нас залежыць. Два разы ўдалося арганізаваць яго для студэнтаў, а больш гандлёвыя арганізацыі не даюць тавару. У аблвыканкоме абяцалі дапамагчы з забеспячэннем студэнтаў дэфіцытнымі таварамі, такімі як халадзільнікі, тэлевізары і іншае. Але, з другога боку, ці па кішэні будзе студэнту купіць гэтыя рэчы? Рэальна нам паабяцалі, што для студэнтаў можна арганізаваць пракат тых жа халадзільнікаў, іншых электрапрыбораў. Калі каго-небудзь са студэнтаў зацікавіць гэта, няхай прыходзяць у прафком. мы арганізуем улік жадаючых і тады будзем выходзіць з канкрэтнымі прапановамі ў адпаведныя арганізацыі. Гэта ўсё справы надзённыя. Калі ў студэнтаў ёсць свае прапановы , пажаданні, няхай прыходзяць ў прафком. Будзем працаваць разам.

**Ітэрв ´ю правяла І. БЕРАЗОВІЧ.**

## ГРОДНА—ПІЦЕРБОРА
## СПОРТ ДЛЯ ЎСІХ



**З 20 па 27 студзеня 1991 года праводзяцца завочныя масавыя фізкультурна-аздараўленчыя спаборніцтвы паміж гарадамі ГРОДНА (СССР) і ПІЦЕРБОРА (Канада).**

**Мэты гэтых спаборніцтваў наступныя:**

**— прыцягнуць найбольшую колькасць сваіх жыхароў да заняткаў фізічнай культурай і спортам;**

**— дасягнуць найбольш высокіх паказчыкаў фізічнай актыўнасці сваіх жыхароў.**

**Умовы правядзення спаборніцтваў:**

**— кожныя фізічныя практыкаванні (хадзьба, бег, гульні, скачкі, танцы і г. д.), якія выконвае адзін чалавек не менш як 20 мінут, дазваляюць яго гораду паглыбіцца на 1 кіламетр касмічнай прасторы да планеты Марс.**

**Спартыўны клуб Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта заклікае студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў прыняць актыўны ўдзел у кантрольным тыдні спаборніцтваў. Для гэтага кожны ўдзельнік павінен на аснове прынцыпаў даверу, чэснасці і высакароднасці фіксаваць на працягу сямі дзён заняткі любой фізічнай дзейнасцю і заносіць у асабістую картку ўдзельніка спаборніцтваў «Гродна-Піцербора». Уліковыя карткі распаўсюджвае спартыўны клуб.**

**20 студзеня ў 12 гадзін дня — адкрыццё спаборніцтваў у рамках агульнагарадскога свята «Здароўе», якое адбудзецца ў лясным масіве «Пышкі».**

**ЗАПРАШАЕМ УСІХ ЖАДАЮЧЫХ!**

# ДАКЛАДНЕЙ БЫЛО ТАК

«Гродзенскі універсітэт» № 32 ад 8 студзеня 1990 года змясціў інфармацыю аб пасяджэнні Вучонага Савета універсітэта. Сярод разгледжаных пытанняў — пытанне **«Аб ходзе выканання калектывам універсітэта доўгачасовай праграмы «Родная мова і культура».** Нажаль, адна з важнейшых на сённяшні дзень праблем не пададзена газетай належным чынам. Па-за межамі ўвагі супрацоўніка рэдакцыі, падрыхтаваўшага інфармацыю, (магчыма таму, што ён не прысутнічаў на пасяджэнні Вучонага Савета), засталася сутнасць складанага, шматграннага і маючага непраходнае значэнне пытання. У паведамленні не адлюстравана тое, што абмеркаванне ішло бурна, выказваліся супрацьлеглыя думкі, уносіліся слушныя прапановы. Галоўнае, у чым была дасягнута згода, тэмпы выканання праграмы «Родная мова і культура» нас не задавальняюць.

Важным момантам у ходзе абмеркавання пытання з ´явілася выступленне К. І. Лецкі, які пазнаёміў прысутных з сумесным рашэннем кафедры беларускай мовы, кафедры беларускай літаратуры і кафедры беларускай культуры. Цэнтральным пунктам гэтага рашэння стала прапанова стварыць на аснове беларускага аддзялення філалагічнага факультэта новы факультэт беларускага мовазнаўства, этнаграфіі і роднай культуры. Вучоны Савет універсітэта прыняў рашэнне ўключыць прапанову ў пастанову па данаму пытанню і адзначыў, што новы факультэт прызваны стаць навуковым цэнтрам развіцця беларускай мовы, літаратуры і культуры, цэнтрам падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Думаецца, што лёс роднай мовы, лёс беларускай культуры, лёс народа больш важная праблема, чым нават зацверджанне тэм кандыдацкіх дысертацый, або паведамленне вучэбнага аддзелу аб інструктыўных дакументах, якім у інфармацыі газеты адведзена значнае месца.

**П. Р. ГАЛУЗА,**
**член камісіі па падрыхтоўцы пытання на Вучоны Савет**

ПАДРЫХТОЎЧЫЯ КУРСЫ

# *ДА ПАСЛУГ РАБОЧАЙ І СЕЛЬСКАЙ МОЛАДЗІ*

У Гродзенскім дзяржаўным універсітэце штогод з верасня праводзіцца набор слухачоў на платныя васьмімесячныя вочна-завочныя падрыхтоўчыя курсы па падрыхтоўцы рабочай і сельскай моладзі да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

На курсах працуюць выкладчыкі універсітэта і вопытныя настаўнікі сярэдніх школ г. Гродна.

Вучэбны працэс на падрыхтоўчых курсах здзяйсняецца па вучэбных планах і праграмах, распрацаваных выкладчыкамі курсаў і адпаведнымі кафедрамі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта на аснове праграм уступных экзаменаў.

**АСНОЎНЫЯ МЭТЫ КУРСАЎ:**

— аказаць дапамогу абітурыентам у самастойнай падрыхтоўцы да ўступных экзаменаў у ВНУ;

— дапамагчы слухачам паглыбіць і замацаваць свае веды.

За час навучання на курсах вы зможаце атрымаць наступную дапамогу:

— авалодаць неабходнымі навыкамі самастойнай работы;

— сістэматычна з дня ў дзень перапрацоўваць неабходную літаратуру, паслядоўна, без пропускаў засвойваць вывучаемыя раздзелы;

— засвоіць вялікі аб ´ём вывучаемага матэрыялу і ўмець выкласці яго правільна, зразумела і лагічна;

— навучыцца абагульняць матэрыял і аргументаваць вывады;

— канспектаваць;

— выконваць практыкаванні самага рознага характару; выпрацаваць уменне самастойна аналізаваць канкрэтныя моўныя з ´явы;

— замацаваць тэарэтычны матэрыял дастатковай колькасцю практыкаванняў і задач;

— паслядоўна вывучаць школьныя падручнікі і рэкамендаваную літаратуру.

На курсах падрыхтоўка праводзіцца па наступных прадметах: рускай мове, рускай літаратуры, матэматыцы, гісторыі СССР, фізіцы, хіміі, біялогіі, грамадазнаўству, беларускай мове, беларускай літаратуры.

**ВЯЧЭРНІЯ КУРСЫ**

Заняткі пачынаюцца ў кастрычніку, праводзяцца 4 разы ў тыдзень.

Методыка выкладання на курсах набліжана да вузаўскай. У працэсе навучання выкарыстоўваюцца розныя арганізацыйныя формы вучэбнай работы: лекцыі, семінарскія і практычныя заняткі, кантрольныя работы, прымяняюцца новыя метады і тэхнічныя сродкі навучання.

**ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ**

Слухачам завочных курсаў па выбраных імі прадметах у пачатку кастрычніка высылаюцца кантрольныя заданні з метадычнымі ўказаннямі па іх выкананню. Кантрольныя заданні і метадычныя ўказанні да іх распрацаваны выкладчыкамі курсаў і адпаведнымі кафедрамі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта з улікам патрабаванняў, прад ´яўленых да абітурыента.

Слухачы-завочнікі па графіку выконваюць і дасылаюць на праверку выкладчыкам кантрольныя работы. Па кожнай кантрольнай рабоце выкладчыкі пішуць рэцэнзіі.

У маі для слухачоў завочных курсаў праводзяцца вочныя заняткі, у ходзе якіх чытаюцца абзорныя лекцыі і выконваюцца практыкаванні па ўсіх раздзелах экзаменацыйных праграм.

Тыя, хто скончыў падрыхтоўчыя курсы, пры паступленні ў вышэйшую навучальную ўстанову здаюць конкурсныя экзамены на агульных асновах і залічваюцца згодна з Правіламі прыёму ў ВНУ. Паступаючыя ў Гродзенскі дзяржаўны універсітэт карыстаюцца правам пераважнага залічэння пры іншых роўных умовах.

**ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ НА КУРСЫ**

На курсы прымаюцца асобы, якія маюць сярэднюю адукацыю, з ліку рабочых, калгаснікаў, служачых, воінаў, звольненых у запас, ваеннаслужачых, а таксама вучняў 11-х класаў, прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў і выпускных курсаў тэхнікумаў і вучылішч.

Па запросу паступаючага на курсы дасылаюцца правілы прыёму і бланк заявы (па форме).

Для залічэння на курсы неабходна даслаць на імя рэктара універсітэта заяву і квітанцыю аб пераводзе грошай па пошце за навучанне і даведку з месца работы або вучобы. У заяве абавязкова ўказаць наступныя даныя: у якім годзе скончыў школу, дамашні адрас з указаннем індэкса, месца работы і кім працуеце, на якія курсы (вячэрнія ці завочныя) паступаеце вучыцца, пералічыце тыя прадметы, па якіх патрэбна падрыхтоўка (не больш 3-х прадметаў).

Аплата за навучанне на падрыхтоўчых курсах робіцца пераводам з любога паштовага аддзялення па адрасу: аблупраўленне жылсацбанка г. Гродна, разліковы рахунак 141703, універсітэт.

У выпадку выбыцця слухачоў пасля пачатку заняткаў унесеная імі плата за навучанне не вяртаецца.

Дакументы прадстаўляюцца асабіста або перасылаюцца па адрасу: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшка, 22, універсітэт, міжвузаўскі вучэбна-кансультацыйны пункт, пакой № 327.

Даведкі аб курсах можна атрымаць па тэлефоне: 44-32-95.

**В. ЧАРТКО,**
**загадчыца падрыхтоўчых курсаў.**

ВЫСТАВЫ Ў ГОРАДЗЕ

# *Упершыню ў Гродне*

Велічная ўрачыстая музыка пад зводамі рэспубліканскага музея гісторыі і рэлігіі. Выступленне камернага хору Гродзенскага педагагічнага вучылішча стала своеасаблівай прэлюдыяй да важнай падзеі ў культурным жыцці нашага горада — адкрыцця выставы работ мастакоў з Фонду вольнага сучаснага рускага мастацтва (Мюнхен).

— Гэтую выставу ўпершыню ўбачаць гродзенцы,— падкрэсліў ва ўступным слове мастак А. Ларыёнаў. — Фонд вольнага сучаснага рускага мастацтва створаны ў многім дзякуючы намаганням Георгія Мікалаевіча Міхайлава, які некалькі гадоў збіраў арыгінальныя работы, маральна падтрымліваў аўтараў.

Карціны, якія прадстаўлены на гэтай выставе, доўгі час адносілі да так званага падпольнага мастацтва. І вось толькі цяпер, літаральна за апошні год, з ´явілася магчымасць шырока пазнаёміць з гэтымі творамі нашага гледача.

Звяртаюць на сябе ўвагу карціны А. Ісачова, М. Шэмякіна, Ю. Жаркіх і іншых аўтараў.

Безумоўна, не ўсе адназначна ўспрымаюць гэтыя работы, але рознае мастацтва мае права на існаванне.

Словам, выстава адкрыта. Яна будзе экспанавацца да 5 лютага гэтага года.

**М. ДУБРАВІН.**

З ГЛЫБІНЬ ЖЫВАТВОРНЫХ

**НЕ ЗРАЎНУЙЦЕСЯ З ПТУШКАЙ МАЛЕНЬКАЙ — ЖУЛАНАМ, ШТО ВЕДАЕ СПЕВЫ ДРАЗДА, САЛАЎЯ, БЕРАСЦЯНКІ — РОЗНАГА ПТАСТВА, МАТЧЫНАЙ ПЕСНІ АПРОЧ.**

**АЛЕСЬ КАСКО.**

# ДАКРАНУЛІСЯ ДА ПАЭЗІІ НАРОДА

З маленства і назаўсёды ўваходзіць у наша жыццё народная паэзія. Спачатку ў дзяцінстве нас вабіць мілагучная калыханка матулі, пазней мы захапляемся дзівоснай бабулінай казкай, уражваемся мудрасцю і паэтычнасцю прыказак, прымавак і загадак.

Праходзіць час, але цікавасць да народных твораў не змяншаецца. Здаўна служаць яны магутным сродкам вобразнага пазнання жыцця. Фальклор не старэе. Вось і едуць маладыя, апантаныя любоўю да матчынай песні ў глыбінку, каб далучыцца да духоўнага багацця свайго народа, каб па крупінках сабраць нашу культурную спадчыну...

У ліпені група студэнтаў-першакурснікаў філалагічнага факультэта праходзіла фальклорную практыку ў Першамайскім сельсавеце Шчучынскага раёна.

Першы наш маршрут пралёг у вёску Замасуяны. Студэнты сустрэліся з жанчынамі, якія беражліва, з павагай адносяцца да народных песень. Асабліва многа цёплых слоў хочацца сказаць у адрас Н. С. Павядайкі, А. К. Саковіч, В. В. Філон, З. Ф. Шышы, В. А. Жук, М. Ф. Дзяшкевіч, Г. У. Сідлярэвіч. Гэтыя прыветлівыя, добрыя, простыя і мудрыя жанчыны спявалі і спявалі нам беларускія народныя песні. Як многа непаўторных каларытных мелодый мы пачулі і запісалі. Вы толькі ўслухайцеся ў гэтыя словы:

Зялёная вішня
З-пад кораня выйшла.
Аддала мяне мама,
Дзе я непрывычна.
Прывыкаці я мушу,
І старому, і малому
Дагаджаці мушу.
Ты думаеш, мама,
Што я тут паную?
Прыйдзі падзівіся,
Як я тут гарую.
Ты думаеш, мама,
Што я тут не плачу?
А я ж за слязамі
Бела света не бачу.
Успомні мяне, мама,
Хоць раз у нядзелю,
А я цябе, мама,
Сцелючы пасцелю.
Успомні мяне, мама,
Хоць раз у аўторак,
А я цябе, мама,
На дзень разоў сорак.
Як выйду на ганак
Ды крыкну дадому:
«Вары, мама, вячэру
І на маю долю»...

Пазнаёміліся таксама і з мясцовымі вясельнымі, радзіннымі і каляндарнымі абрадамі і звычаямі. Пачулі цікавыя звесткі пра святкаванне сёмухі. Сёмуха — позняе веснавое свята. Яно прысвячалася ўшанаванню раслліннасці. Яго святкавалі тры дні. Напярэдадні сёмухі дзяўчаты, упрыгожаныя вянкамі з лугавых кветак, ішлі ў гай завіваць бярозкі. Назад яны вярталіся з зялёнымі галінкамі і імі ўпрыгожвалі хату ўнутры і знадворку. На падвор ´і сцежкі пасыпаліся жоўтым пяском. На сёмуху спявалі сёмушныя (траецкія) песні. Моладзь наладжвала гульні і розныя забавы, якія мелі пэўны абрадавы сэнс.

А як не ўсміхнуцца пасля зухаватых прыпевак Алены Казіміраўны Саковіч І Надзеі Сямёнаўны Павядайкі:

Баба дзеда шанавала,
На папары навязала.
— Еш, дзед, траву палявую,
Пі вадзіцу лугавую.
Або:
Без музыкі, без дуды
Ходзяць ногі не туды.
Як музыку пачуюць
Самі ногі танцуюць.

Пабывалі нашы студэнты і ў вёсцы Матылі. Тут пад кіраўніцтвам загадчыцы сельскай бібліятэкі Людмілы Вікенцьеўны Павядайкі створаны фальклорны калектыў. Занятыя нялёгкай сялянскай працай, жанчыны знаходзяць час і сілы, каб разам сабрацца, паспяваць, даць адпачыць сабе і павесяліць людзей.

Зацікавілі нас гісторыя першамайскага сельсавета і паходжанне тапонімаў і мікратапонімаў (назвы месц). Вельмі цікавыя звесткі аб узнікненні былых назваў вёскі Першамайск расказала жыхарка вёскі Замасцяны васьмідзесяцігадовая Алена Мацвееўна Сідлярэвіч.

Вёску Першамайск назвалі так у гонар свята 1-га Мая дзеці ў 50-я гады. Але хоць пасля гэтага прайшло каля сарака гадоў, людзі, асабліва старэйшыя, арыентуюцца на старую назву — Сабакінцы. Царом Іванам Грозным быў высланы сюды ў ссылку баярын Сабакін. Пэўна, ад яго прозвішча і пайшла назва вёскі. Прыблізна ў другой палове 18 стагоддзя адбылося хрышчэнне царквы, якая знаходзіцца у Першамайску. Гэта было на рэлігійнае свята Пакрова. У сувязі з гэтым вёску некаторы час называлі Пакроўскае. З 1921 года па 1939 год Першамайск называлі Нарбутава, у гонар Тэадора Нарбута, адважнага ўдзельніка паўстання 1863 года пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага. Усе гэтыя звесткі гучалі для нас як жывая гісторыя.

Прыветлівыя, добразычлівыя і гасцінныя людзі жывуць у вёсках Першамайскага сельсавета. Але не сакрэт, што многім, асабліва нашым сучаснікам, работа па збору фальклору здаецца непатрэбнай і пустой. Вельмі шкада нам гэтых людзей! Колькі мудрасці, розуму, мілагучнасці і сардэчнасці заложана ў творах народнай паэзіі. Яна вучыць дабру і справядлівасці, самаадданай любові да роднай краіны і свайго народа.

У канцы хочацца падзякаваць усім, хто нас ветліва прымаў і пажадаць ім поспехаў, здароўя і шчасця.

**У. КАЯЛА, Д. ЛЕБЯДЗЕВІЧ,**
**кіраўнікі фальклорнай практыкі, выкладчыкі кафедры рускай і замежнай літаратуры.**



# «Наднёманскія галасы»



## Таццяна Шляжко

* * *

Крывавы след на крывавым снезе...
Ад снегу крывавыя цені...
Дзень напоўнены сонцам
ад краю да краю...
Знаю, знаю, знаю...
У сабе тую сілу хаваеш...
Тую, што зрабіла чырвонымі
дня і ночы каноны.

* * *

Цішыня... Распасцертыя крылы начныя
душаць, сцягваюць воблакі,
апаясваюць з усходу на захад
агнявымі вачыма ланцугоў.
Цішыня... Што хаваецца
пад гэтай маскаю?
Запрашае яна да гульні,
дражніць гукамі ды без падказкі
выпускае і цені падманныя.
Цішыня нечакана мой сон забірае,
як чароўную ляльку і клёну дае.
І цяпер яго дзеткі-лісточкі
са мной размаўляюць
На нядаўна адшуканай мове...

* * *



## Ігар Заўялаў

### Вершы для дзяцей

Красной вьюгою над хатой
Намело сугроб зари,
Красногрудые куда-то
Улетели снегири.
Побросав свои салазки,
В мокрых шубах со двора
В самый раз к вечерней сказке
Прибежала детвора.
Ну, а завтра день недлинный
Снова выманит ребят
И за красною калиной
Снегири вновь прилетят.

* * *

Не прогнется половица,
Тихо в доме до утра,
Малым детям сказка снится,
Снится шумная игра.
Песня ходиков настенных
Не пугает тишину,
Занавесок белых тени
Прячут грустную луну.
Не прогнется половица,
Тихо в доме до утра,
Малым детям сказка снится,
Ждет их шумная игра.

* * *

Нет важнее в мире дела,
Чем шагать своей дорогой —
Босоногого пострела
Манит к речке склон пологий.
Хороши речные мели,
Где мальки и флот бумажный,
Где идет на самом деле
Предпоследний бой отважный.
И напрасно машет мама
На пригорочке рукой,
Боевого капитана
Дозывается домой.

* * *

По деревне нашей тройка
Мчалась весело.
Так, что в окнах пело звонко
Мерзлое стекло.
А под вечер закружила
Возле хат метель,
Понесла лихая сила
Сани на плетень.
Опрокинулся счастливый
Зимний день в сумёт,
Разметали кони гривы
В красный небосвод.

* * *

## Юрась Пацюпа

### Гайка

Мы — знакі, іерогліфы часоў,
ты на сямнаццаць міліметраў гайка,
хаця табе і чвэрць стагоддзя з гакам,
твой век жалезны ўжо калі прайшоў.

Як «Іліяду» прачытаю зноў
спіраль-дарогу, шасцікутнік гладкі,
вясёлкавыя ў мутнай люстры згадкі,
над чэрствай пожняй крылы груганоў.

Я разумею, што такое шрубка —
і не вяха, і, нават, не зарубка —
заменяць , выкінуць, перакуюць...

Ды, каб унікнуць мудрацоў увішных,
што ашчасліваць і прапішуць, будзь
дзеля карысці непрыдатнай, ЛІШНЯЙ.

### Хутар

Крок наўзбоч — і пасецца трава,
ідуць баба, карова і кот,
нібы троіца ці радня,
і сядаецца месяц на плот,

бае казкі пра кудасу ўзіму,
пра Кудыкіну гору, дзе я
недаспелую ем маліну,
пра вучоных мышэй караля.

А сцямнее — як рыба ў талерцы —
белы месяц; абліжацца кот,
будзе венік таўчыся ў сенцах,
стаяць час, пазяхаць стары бот.

### Анямелы тэатр

Заблукае драўляны мядзведзь
у дзіцячыя сны,
пакаштуе — і болей не схоча маліны
і мёду,
а за ім і другія звяры — па карунках
падушкі,
па абрыву ўначы... (Гэты шлях не
намацаць рукою.)
Вось не ведае збан: зазвінець?
разляцецца? ці зноў
да пары атуляць гаваркую калісьці
ваду? —
гэта ўсё анямелы, да дробнай пылінкі
тэатр,
дзе згубілі не толькі ключы, а канцы
і пачаткі,
дзе паблыталі маскі... Ды ўсё ж
не скончаецца дзея,
і на плоце пад сонцам дагэтуль вісяць
гладышы.

## Андрэй Пяткевіч

Слёзы ад жорсткасці,
Слёзы ад радасці,
Слёзы ад шчасця
І ад бяды —
Скрозь вы аднолькавы,
Сумныя, горкія...
Колькі ж вас ёсць,
Непатрэбнай вады!

* * *

### Час восені

Дажджы і вецер злосны.
Не просім мы
Палёгкі ў дарог.
Час восені.
На зёлках мерзнуць росы.
У полымі —
Недасягальны Бог.

## Юры Карэйва

### Шкоднікі

Чуеш грукат па бруку калёс,
Чуеш тупат падкоў на мяжы?..—
То скаціўся з-пад самых нябёс
Грозьба-гром па-над садам чужым.
Ды не гром! Гэта — дзед Бедавед
Копы хмар паўскладаў на свой воз
Ды спяшае дамоў на абед.
Нас убачыў — і пугай затрос.
Вунь як грозна хрыпіць яго конь!
З-пад усіх чатырох аж звініць,
Выкрасае маланак агонь,
Кроплі шроту распрысквае ніц!
Будзем знаць, як гуляць па садах,
Латашыць грушы й яблыкі красць...—
Дык хутчэй уцякайма пад дах,
Бо дагоніць ды моцна надасць!

* * *

Год за годам міне — ты забудзеш
мяне,
Свае ўцехі з другім дзяліць будзеш.
На мяне ж назаўжды ўжо забудзешся
ты
Ты мяне назаўсёды забудзеш...
Але, як на бяду, я аднойчы прыду.
Я прыду ў твае сны — і ад болю
Анікуды тады ўжо не дзенешся ты:
Дзе ні ступіш — я буду з табою!



## Таццяна Абухоўская

* * *

Снова ночь. И в тихую погоду
Улыбнулась звездочка Регул.
Грустно мне — ну хоть бросайся в воду,
Побывав на этом берегу.
До утра утихла суматоха,
Новый день за горизонт ушел.
Я грущу не от того, что плохо,
От того, что слишком хорошо.
Жизнь моя — короткий сон, который
Мне приснился ночью как-то раз.
А теперь пора задернуть шторы,
Потому что свет в душе погас.
Загорится ль? Это неизвестно,
Всё ж надежду в сердце берегу,
Потому что мне из черной бездны
Улыбнулась звездочка Регул.

* * *

Сон-не сон и не явь, а жалко.
Жалко этой лиловой ночи.
Легкомысленная русалка
До утра в камышах хохочет.
Сон-не сон, а звенит прохлада
На неведомой нам орбите.
Мне от вас ничего не надо,
Что же вы от меня хотите?
Сон-не сон. Я закрою двери,
Будут свечи гореть до рассвета,
И случайно сама поверю,
Что еще бродит счастье где-то...

# НА ЭКРАНАХ КІНАТЭАТРАЎ ГОРАДА

У жанры гістарычнай драмы знята беларуская карціна **«Маці Урагана».** Рэжысёр Юрый Марухін, які некалі прыязджаў на Гродзеншчыну ў дні прэм´еры свайго фільма «Чалавек, які браў інтэрв´ю», на гэты раз звярнуўся да п´есы Уладзіміра Караткевіча. Дзеянні новай ленты Марухіна пераносяць нас у ХУІІІ стагоддзе, у часы паўстання беларускіх сялян супраць феадалаў. На чале бунту — просты сялянскі сын Васіль Вецер, які не спалохаўся пагрозы пакутнай расправы. З благаслаўлення маці здзяйсняе Васіль ратныя подзвігі. У галоўныхролях — Людміла Палякова, Аляксандр Гоманюк, Генадзь Гарбук, Аляксандр Філіпенка.

Знатакам прозы Васіля Бялова асабліва спадабаецца кінааповесць **«Па — 206-ы»,** пастаўленая рэжысёрам В. Кальцовым па аднайменнай п´есе пісьменніка.

Пачалася гэта вясковая гісторыя са спрытнага пеўня, якому спадабалася суседская курачка... З-за яго пабіліся хлопчыкі, з-за хлопчыкаў — іх старэйшыя браты, затым пасварыліся маці, а калі справа дайшла да бацькоў сямействаў, не абыйшлося без разнесенага ўшчэнт плоту. Вось як бывае, калі справа пачынаецца з дробязі, а даходзіць да суда! На экране каларытныя замалёўкі чалавечых характараў, супярэчлівых і розных.

На любы густ выбар замежных кінастужак у студзені!

**«Загад № 027»** — гэта прыгодніцкая стужка для прыхільнікаў . ?эта аб атрадзе смельчакоў у тыле ворага.

Тры новыя польскія фільмы чакаюць гледачоў.

**«Распарадчык балю»** паведамляе пра маладога канферансье, які пайшоў на шантаж і здраду дзеля магчымасці стаць вядучым грандыёзнага тэлешоу.

**«Калі ты дзе-небудзь ёсць»** — гісторыя кахання маладога чалавека да сваёй жонкі, якая страціла розум.

**«Бермудскі трохкутнік»** — арыгінальны кінадэтэктыў. Лёсы трох таварышаў звязвае тугі вузел трох не звязаных паміж сабой злачынстваў. Як гэта магло стацца? Паглядзіце ў кінатэатрах!

Венгерскі фільм **«Сем тон доляраў»** вельмі займальны...Аднойчы ў цырку леў ледзь не адкусіў галаву свайму дрэсіроўшчыку. Трупу з ганьбай выганяюць з горада, але вось тут і пачынаюцца сапраўдныя прыгоды акцёраў!

Індыйская версія легенды пра высакароднага разбойніка Робін Гуда называецца **«Сябар бедных».**

Жан-Поль Бельмандо, Жан-Луі Рышар і Роберт Асейн парадуюць аматараў французскага кінабаевіка. У фільме **«Прафесіянал»** мы ўбачым гэту бліскучую троіцу, раздзеленую пачуццём помсты і варожасці.

Для дзяцей у пачатку студзеня па традыцыі выпускаюцца кіна-казкі. У час зімовых школьных канікул дзеці ўбачаць на экранах кінатэатраў фільмы **«Вундэркінд», «Кай са скрыні», «Мегі», «Кароль і птушка», «Нявеста падземнага прынца», «Айбаліт — 66», «Галёшы шчасця», «Залатыя рогі», «Фініст — ясны сокал»** і многія іншыя казкі.

**НА ЗДЫМКУ: кадр з фільма «Загад № 027».**




Наш адрас:
230023, г, Гродна,
вул. Ажэшка, 22, пакой 404,
тэл. 44-72-97

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня
вул. Паліграфістаў, 4.

Зак. 317
2000 экз.

Рэдактар
Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ.